*Змагары за народнае шчасце*

# Таварыш Ян

## ДА 80-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. Б. ГАМАРНІКА

Яму споўнілася 23 гады, калі ён узначальваў Кіеўскі камітэт РСДРП(б), быў выбран сакратаром Кіеўскага губкома партыі. Хоць яшчэ не мінула і года, як Яна Гамарніка прынялі ў рады ленінскай партыі, ён ужо быў добра вядомы як энергічны, ініцыятыўны, смелы падпольшчык, здольны арганізатар, палымяны прамоўца.

Ішла грамадзянская вайна. Над Савецкай рэспублікай навісла смяротная небяспека. Каб не дапусціць аб'яднання пятлюраўцаў з дзянікінцамі, 45-я, 47-я і 58-я стралковыя дывізіі былі зведзены ў паўднёвую групу 12-й арміі. Камандуючым групай стаў легендарны герой грамадзянскай вайны Іона Якір, а ў Рэўваенсавет групы ўвайшлі Ян Гамарнік, Лаўрэн Картвелішвілі, Уладзімір Затонскі.

...

быўся XII з'езд Кампартыі Беларусі. У справаздачным дакладзе ЦК КП(б)Б Ян Гамарнік падвёў вынікі работы партыі па індустрыялізацыі і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ён заклікаў камуністаў рэспублікі павысіць пачуццё адказнасці за даручаную справу, выхоўваць і вылучаць новыя маладыя кадры ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

У размове з аўтарам гэтых радкоў былы першы сакратар Чэрыкаўскага райкома, міністр юстыцыі БССР, цяпер персанальны пенсіянер І. Д. Ватроў сказаў: «Мне неаднаразова пашчасціла сустракацца з Янам Барысавічам Гамарнікам, гэтым выдатным дзеячам нашай партыі і дзяржавы. Усю сваю кіпучую энергію ён аддаваў справе будаўніцтва сацыялізму ў



намеснікам наркома абароны СССР.

Ян Гамарнік быў чулым, спагадлівым і сардэчным чалавекам. Прамяністыя вочы, прыветлівы адкрыты твар, акаймаваны злёгку кучаравай барадой, — такім памятаюць яго старыя камуністы. Яму былі арганічна чужыя бюракратызм і фармалізм. Усе, хто звяртаўся да яго, нязменна знаходзілі добры прыём і атрымлівалі кваліфікаваныя парады.

Гамарнік быў вельмі сціплым чалавекам. Генерал-маёр у адстаўцы А. А. Лабачоў, які добра ведаў Гамарніка, прыгадвае два наступныя эпізоды з яго жыцця. У сваім першапачатковым варыянце рамана «На ўсходзе» пісьменнік П. Паўленка прысвяціў Гамарніку цэлы раздзел. Ян Барысавіч, прачытаўшы рукапіс, прасіў нічога пра яго не пісаць, ні ў якім разе не ўспамінаць яго прозвішча. І пісьменніку давялося пакінуць у рамане толькі некалькі радкоў пра «невысокага барадатага чалавека з добрымі вясёлымі вачыма».

Яшчэ да назначэння начальнікам Галоўпура Ян Гамарнік сур'ёзна захварэў. Згодна са спецыяльным рашэннем ЦК партыі, яго накіравалі на лячэнне за граніцу. Але ён не прабыў

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы